ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
29 красавіка
1993 года
№ 7 (1694)

НАПЕРАДЗЕ

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ ПРА ГАДЗІННІК

Калісьці падыхаць свежым паветрам клікаў студэнтаў камсамол, цяпер надышлі часы Цэнтра маладзёжных ініцыятыў.

Як і раней — у Вязынку, але не проста на турыстычны злёт, а ўжо на студэнцкі фестываль Белдзяржуніверсітэт-93».

Гэта значыць, праграма актыўнага студэнцкага адпачынку будзе пашырана. Адных толькі спартыўных мерапрыемстваў набярэцца па адзінаццаці відах.

Ёсць значны матэрыяльны стымул — прызавы фонд, выдзелены ўніверсітэтам складае каля 70 тысяч рублёў.

Перад самай сесіяй, 14 мая, камандамі ды паасобку дастаткова сесці на электрычку «Мінск — Маладзечна», праехаць 38 кіламетраў на паўднёвы захад, каб апынуцца ў Вязынцы.

У нядзелю 16 мая — сустрэча світанку пасля начной дыскатэкі і вяртанне ў Мінск.

А гадзіннік спатрэбіцца не толькі дзеля турыстычнай эстафеты. Галоўнае — не праспаць магчымасці сустрэцца са старымі і новымі сябрамі, набыць шмат уражанняў.

Т. КАЗАК.

ПОСТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ПАДАЙЦЕ НА ПЕЛЬМЕНІ

Аб'явіць аб павышэнні мінімальнай заработнай платы, на жаль, не азначае забяспечыць пакупную здольнасць паперак, якія ў рознай колькасці, але ёсць у кожнага.

Не паспеў яшчэ бедны студэнт шыкануць на сваю новую стыпендыю (бо атрымаў яе 21 ці, што яшчэ горш, 23), як 20 красавіка зноў скакнулі ўгору цэны на мяса і мясапрадукты: свініна падаражала ў 1, 9, ялавічына — у 1,7 разоў. Ды нават не ў свініне справа. Яе ў магазінах усё роўна няма, і студэнт такія прадукты даўно не ўжывае. Пельмені і тыя сталі каштаваць амаль у два разы даражэй.

Але, аказваецца, як растлумачылі нам у аддзеле сацыяльнай абароны насельніцтва Дзяржкамправы: усё, як мае быць. Сапраўды, хіба першы раз і ці з аднымі студэнтамі здараецца такі казус?

Больш таго, у Дзяржкампрацы ўжо ідзе пераразлік новай сумы, якая будзе складаць мінімальную заработную плату. Лагічна меркаваць, што наперадзе яшчэ адно (а хутчэй за ўсё не адно) падаражанне.

А пакуль памер мінімальнай стыпендыі: для студэнтаў ФПМІ і мехмата складае 4.500 рублёў, для навучэнцаў усіх астатніх факультэтаў — 3.600. А гэта азначае, што змагар на фронце ведаў можа дазволіць сабе ў дзень пайку з аднаго пачака пельменяў альбо (у адпаведнасці з факультэтам) 370 ці 200 грамаў варанай каўбасы. Гэта калі без хлеба.

ДОШКА АБ'ЯЎ

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх і класічных моў; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; глебазнаўства і геалогіі; фізвыхавання і спорту;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: лікавых метадаў і праграміравання; фізічнай геаграфіі і аховы прыроды; тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: псіхалогіі; эканамічных навук; фізікі паўправаднікоў; біяфізікі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі; матэматычнай фізікі; лікавых метадаў і праграміравання; фізіялогіі чалавека і жывёл; грамадзянскага права; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх і класічных моў; радыёфізікі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: педагогікі; псіхалогіі; фізвыхавання і спорту; гісторыі новага і найноўшага часу; грамадзянскага права; грамадзянскага працэсу і працоўнага права; экалагічнага і аграрнага права;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі; вышэйшай матэматыкі; цвердацелай электронікі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Минск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

ТУСОЎКА

СВЕТ ПАБАЧЫЦЬ, СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

З 5 па 9 мая ў горадзе Віцебску адбудзецца другі рэспубліканскі фестываль «Студэнцкая вясна». Два гады таму назад, калі фестываль праводзіўся ўпершыню. на яго з'ехаліся калектывы мастацкай самадзейнасці амаль з усіх ВНУ Беларусі. Былі там і прадстаўнікі нашага універсітэта.

Плануецца, што ў гэтым годзе ад Беларускага дзяржаўнага паедуць на фестываль два калектывы: аркестр народных інструментаў і ансамбль народнага танца «Крыжачок». Але гэта яшчэ пад вялікім пытаннем. Як заўсёды, не вырашана фінансавая праблема. А паехаць так хацелася б. У гэтым годзе праграма фестывалю вельмі пашыраная.

АД КАМЕНЯ Ў КІШЭНІ ДА ПРЫГАЖОСЦІ Ў СЭРЦЫ

«...Будучыня камянёў не ў іх каштоўнасці, не ў багацці, якое на іх затрачана, а ў іх харастве, у гармоніі фарбаў, колераў і форм, у іх вечнасці»,— так захапляўся камянямі Ферсман. Яго словы я ўбачыла на адным з плакатаў, якія запрашалі на першую мінералагічную выставу-кірмаш.

А ладзілася выстава, арганізаваная Беларускім геаграфічным таварыствам і геаграфічным факультэтам універсітэта 10 і 11 красавіка. Па словах ***Крысціны Міхалаеўны РАМАНЕНКІ,*** *супрацоўніцы музея землязнаўства, падзівіцца на каменную казку прыйшло каля дзвюх з паловай тысяч чалавек.*

Вырабы з чараіта, малахіта, халцэдона, кашачага і сакаліная вока ўяўлялі сабой дзівосныя відовішчы. Цана іх гойдалася ад 40 рублёў за маленькі каменьчык раданіту да 300 даляраў за прыгожую скарбонку. Зрэшты, хто пакутваў без валюты, меў магчымасць разлічвацца «драўлянымі» альбо «пушніна».

Гандляры акупіравалі больш за трыццаць столікаў. Свае вырабы прапаноўвалі і аўтары непаўторных работ з прыватных калекцый, і прадстаўнікі фірм з Кіева і Нарыльска, Якуціі і Урала, Масквы і Санкт-Пецярбурга. Нават з замежнага Хельсінкі ад мінералагічнай фірмы «Універс».

Наталля КОНЮХАВА,
вучаніца 11 класа 185-й школы г. Мінска.

НАВІНЫ

НАВУКІ

ШТО ВЫСВЕЧВАЕ БЕЛАРУСКІ ЛАЗЕР?

Згодна з пастановай прэзідыума Савета Міністраў РБ на базе фізічнага факультэта БДУ створаны Міжнародны лазерны цэнтр. Падстаў для стварэння такога цэнтра ў рэспубліцы шмат. Высокі ўзровень даследванняў беларускіх лазершчыкаў вядомы і прызнаны нават за мяжой. Яшчэ раней да іх паступалі прапановы ад такіх магутных і развітых краін, як Злучаныя Штаты Амерыкі, Швейцарыя, Ірландыя.

Мэта арганізацыі Міжнароднага лазернага цэнтра — стварэнне ў рэспубліцы буйной базы для далейшых даследванняў, каардынацыя работы спецыялістаў-лазершчыкаў і сувязей з замежнымі партнёрамі і арганізацыямі. Сёння беларускімі спецыялістамі вядуцца даследванні і ўжо зроблены каштоўныя вынаходніцтвы, створаны сучасныя лазерныя сістэмы ў галінах тэхналогіі, оптыкі, аховы навакольнага асяроддзя.

ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ

НЕ ШУКАЙЦЕ ВІНАВАТЫХ

Марна было б спадзявацца, што першыя тры месяцы 1993 года стануць выключнымі ў эпапеі дарожнага руху. Дысцыпліна на дарогах за гэты час не палепшылася.

Здзейснена 168 дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх загінула 32 чалавекі і паранена 58 чалавек. Узрасла колькасць здарэнняў па віне пешаходаў — 108 ДТЗ.

Не шукайце вінаватых, лепш прааналізуйце для сябе асноўныя прычыны ДТЗ: перасячэнне перакрыжаванняў пры забараняючым сігнале светлафора як пешаходамі, так і вадзіцелямі, знаходжанне ўдзельнікаў дарожнага руху ў нецвярозым стане, ігнараванне нерэгулюемых перакрыжаванняў, пераход пешаходамі вуліцы перад блізка едучым транспартам.

Мікалай ДЗЕРГАЧОЎ,
дзяржаўтаінспектар.

ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ

«Сакавіцкія кошкі» сустрэліся ў красавіку

Амаль незаўважанымі засталіся «Сакавіцкія кошкі» год назад. Так называўся першы фестываль жаночага кіно, які прайшоў у Мінску.

І вось у другі раз у сталіцы Беларусі — Міжнародны кінафестываль жаночага кіно. Унікальныя стужкі з асаблівым светаўспрыманнем Кіры Муратавай, Ланы Гогаберыдзе, непаўторныя камедыі Святланы Дружынінай і Алы Сурыкавай, фільмы не менш вядомых «рэжысёрш» Захаду, па меркаванню арганізатараў акцыі, даюць жанчынам-кінематаграфістам права мець уласны кінафестываль.

Ідэя яго нарадзілася ў незалежнай студыі «Таццяна». Галоўная тэма, што аб'ядноўвае ўсе фільмы фестывалю — каханне як усеабдымны вялікі пачатак усяго добрага і сапраўднага на гэтай планеце.

А каб разгуляцца на поўны моц, у межах фестывалю прайшлі дыскусіі па тэмах «Жанчына і палітыка», «Жанчына і бізнес», «Жанчына і экалогія». Вялі іх моцныя прадстаўніцы слабога полу: парламентарыі, прадпрымальнікі, вучоныя, лідэры партый і грамадскіх рухаў. Сярод гасцей нават Галіна Старавойтава і Казіміра Прунскене.

(Матэрыял аб адным з фільмаў, паказаных на фестывалі чытайце на 3-й і 4-й старонках).

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА

ЛЕПШУЮ НАВУКОВУЮ РАБОТУ СЯРОД МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

Конкурс праводзіцца па чатырох секцыях:
— матэматычныя і фізіка-тэхнічныя навукі;
— хімія, біялогія, геаграфія;
— гісторыка-філасофскія і эканамічныя навукі, права;
— філалогія, журналістыка, псіхалогія і педагогіка.

Для пераможцаў конкурсу ў кожнай секцыі прадугледжваецца адна прэмія памерам мінімальнай заработнай платы на момант правядзення конкурсу.

ПРАВЯДЗЕННЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ (НДР) МАЛАДЫМІ ВУЧОНЫМІ

Тэмы НДР, якія вылучаюцца на гэты конкурс, павінны мець бясспрэчную актуальнасць, выконвацца па прыярытэтных накірунках навукі (гуманітарных альбо прыродазнаўчанавуковых), уяўляць тэарэтычную і практычную каштоўнасць.

Фінансаванне НДР (дзве на 1993—1994 гады), вызначаных конкурсам, ажыццяўляецца з фондаў універсітэта тэрмінам на два гады.

Перамога ў гэтым конкурсе — добрая магчымасць для рэалізацыі вашых ідэй і самасцвярджэння ў навуцы. Так лічаць пераможцы прайшоўшых конкурсаў. У гэтым зможаце ўпэўніцца і вы, калі будзеце ўдзельнічаць у нашым конкурсе.

Мы зычым вам перамогі!

Узрост удзельнікаў абодвух конкурсаў абмежаваны 35 гадамі.

За дадатковай інфармацыяй звяртайцеся да старшыняў саветаў маладых вучоных факультэтаў ці да старшыні СМВ БДУ дацэнта І. І. Ганчаронка (тэл. 26-57-47).

СМАЧНА ЕСЦІ

СОЛА САЛА

Студэнты могуць жыць паўсюль. І ў інтэрнаце таксама. Па два, тры, чатыры, пяць чалавек у адным пакоі. Але не зважаючы на такі незвычайны эксперымент, адзін аднаго пакуль не ядуць. Магу гэта пацвердзіць.

Звычайны жыхар інтэрната рэдка снедае, бо паўстае праблема выбару: спазніцца на заняткі ці крыху паварушыцца, каб хуценька нешта прыгатаваць, і пад соннае мармытанне суседзяў усё ж падсілкавацца, выслухваючы пры гэтым іх «ласкавае» накшталт «смачна есці». Практыка ж паказвае, што лепш ціхенька сабрацца і хутка знікнуць. Крыху лягчэй, праўда, калі першую пару наведваюць усім пакоем.

Абед — у сталоўцы. А потым можна набыць што-небудзь у магазіне, каб падсілкавацца ўвечары. Скажам, некалькі бутэлек малака, хлеб, зрэдку масла, цукар, сыр, смятану, калі-небудзь кавалачак самай танной каўбасы — і паход у магазін абыходзіцца ў 600—700 рублёў. Таму звычайна студэнт купляе толькі хлеб і малако. У пятым інтэрнаце ў адным з пакояў існуе такая негалосная дамоўленасць. Калі няма грошай у Святланы і Марыны, у магазін ходзіць Ганна. І — наадварот. Гатуюць — па чарзе. Гэта называецца братэрская ўзаемадапамога.

Увечары агульная кухня — кіпіць. Калі ў цябе няма запалкаў — знойдзеш там. Калі не назапасся солі — пазычыш на кухні. І наогул, у інтэрнаце, аказваецца, можна прыгатаваць усё, што ні пажадаеш. Галоўнае вырашыць, што трэба знайсці і ў каго які прадукт можа яшчэ захавацца.

Лёгка ідуць насустрач першакурснікі: новыя ўражанні, новыя знаёмствы; ды й дадому яны ездзяць часцей. Асабліва добразычлівыя студэнты хімічнага факультэта. А прыстасоўваюцца да іх — будучыя журналісты. З кожным курсам студэнт набывае вопыт і на пятым дасягае такой віртуознасці, што толькі і ходзіць у госці, калі згаладаецца. Чым старэйшы студэнт — тым больш у яго знаёмых. Адсюль вынік: з цягам часу ўдаецца менш сродкаў выдаткоўваць на харчаванне. Лепш за ўсіх гэта атрымліваецца ў хлопцаў з геафака, якія жывуць у пятым інтэрнаце.

Існуе і яшчэ адна заканамернасць: пасля вялікіх святаў (Новы год, канікулы) усе прывозяць з дому столькі прадуктаў, колькі здолеюць падняць. Самае смачнае знішчаецца ў першы тыдзень. Потым — бульба. Дарэчы, я

не сустракала студэнтаў, якія б яе куплялі. Калі б не агародніна бацькоў — было б яшчэ складаней.

Маладая студэнцкая сям'я — Таццяна і Уладзімір — толькі зрэдку дазваляе сабе частавацца нейкімі ласункамі, але на харч ідзе ўся стыпендыя, не ўлічваючы цану прадуктаў, што прывезены з дому. Каля сямі тысяч. Муж Таццяны вымушаны падрабляць лабарантам на кафедры.

Самы ж трывалы прадукт сярод інтэрнацкіх прысмакаў — сала. Але набліжаецца і ягоная чарга: за некалькі дзён да стыпендыі, напрыклад, сала — уратаванне. У інтэрнатах яго ядуць нават тыя, хто раней ніколі ў сваім жыцці аб яго існаванні не падазраваў. І толькі тут адчуваецца незвычайны смак.

Таццяна КАЗАК.

СЛУЖБА 03

ДАЦЬ КРОЎ — ВЫРАТАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ

Сёння цяжка назваць галіну медыцыны, дзе для лячэння хворых не выкарыстоўвалася б донарская кроў, яе кампаненты і прэпараты.

Кроў — асаблівае лякарства, вытворчасць якога немагчыма наладзіць ні на адной з фармацэўтычных фабрык. Затое колькі каштоўных прэпаратаў можна прыгатаваць з самой крыві! Скажам, альбумін, які незаменны пры лячэнні шокаў, ацёку мозга, лёгкіх, цяжкіх інтаксікацый і многіх іншых захворванняў. На жаль, гэты прэпарат сёння застаецца востродэфіцытным, і атрымлівае яго толькі кожны другі з тых, хто мае патрэбу.

Прычына адна — не хапае донарскай крыві. Для атрымання толькі адной дозы альбуміну патрабуецца 1,5 — 2 літры крыві. А донараў апошнім часам не большае. У новых эканамічных умовах высакародны рух апынуўся ў разрадзе нявыгадных: б'е па кішэні.

Кроў — гэта вадкая тканка, якая пастаянна абнаўляецца. Яна звязвае арганізм у адзінае цэлае і забяспечвае дыханне і харчаванне кожнай клеткі. Пажыўныя рэчывы, якія знаходзяцца ў растворанym становішчы ў плазме, кроў аддае тканкам, а тыя ў сваю чаргу аддаюць крыві адпрацаваныя прадукты, якія выдзяляюцца з арганізму ныркамі, лёгкімі і скурай.

Страта крыві ў вялікай колькасці небяспечна для жыцця, а вось рэгулярная дача крыві (як высвятлілася пасля шэрагу даследаванняў) можа быць нават карыснай для арганізму, таму што аднаўляе склад крыві, стымуліруе дзейнасць органаў крывазвароту, паляпшае самаадчуванне чалавека і яго працаздольнасць. Людзі-донары радзей хварэюць на прастудныя, анкалагічныя захворванні, радзей пакутуюць на парушэнні дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы. Многія з іх у састарэлым узросце далей захоўваюць разумовую і фізічную актыўнасць. Урачы лічаць зусім бясшкодным здаваць кроў па некалькі разоў у год з інтэрваламі ў два месяцы.

Праўда, не кожны можа быць донарам. Не падыходзіць кроў людзей, якія перанеслі хваробу Боткіна, туберкулёз, шэраг іншых захворванняў. Таму абавязкова трэба параіцца з урачом.

Прайшлі часы «добраахвотнай прымусоўкі», але засталося такое паняцце, як міласэрнасць. Людзі па-ранейшаму хварэюць, атрымліваюць знявечанні, адчуваюць патрэбу ў хірургічных аперацыях. Таму так важна, каб ведалі пра тыя драматычныя сітуацыі, што здараюцца часам у бальніцах, у радзільных дамах, у педыятрычных клініках у сувязі з пагрозай зніжэння забеспячэння гэтых установ кампанентамі і прэпаратамі крыві, што, здараецца, прыводзіць да гібелі хворых.

Не след забываць, што донарства — катэгорыя маральная. Яна ў значнай ступені вызначаецца ўзроўнем культуры кожнага чалавека паасобку і грамадства ў цэлым.

Л. ПАНКРАТАВА,
загадчыца аддзялення пералівання крыві 2-й клінічнай бальніцы.

ОДА БУЛАЧЦЫ

У сям'і людаеда. Жонка ўпрошвае мужа: «Не лаві ты больш гэтых студэнтаў. Той учарашні, пакуль у супе варыўся, усю бульбу з'еў.

СА СТУДЭНЦКАГА ФАЛЬКЛЕРУ.

1. ЧАМУ СЯРОД МАІХ СЯБРОЎ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ ВЕГЕТАРЫЯНЦАЎ.

Я з жахам назіраю, як іх сапраўды становіцца ўсё больш і больш. На першым курсе я ведала толькі аднаго перакананага вегетарыянца, які, напэўна, па начах, пакуль ніхто не бачыць, часцяком дазваляў сабе маленькія слабасці. Але вось учора яшчэ двое і на сняданак, і на абед узялі толькі булачку з кампотам. Гэта першая прыкмета таго, што чалавек становіцца вегетарыянцам. А паглядзіце, які натоўп заўсёды таўчэцца ля кіёска з булачкамі і «Пэпсі» ў фае галоўнага корпуса!

Булачка і кампот ці кубачак кавы (але апошняе ўжо прывілея заможных) сталі асноўным прадуктам харчавання для студэнтаў. Чаму? Прычын вельмі шмат. Па-першае, танна. Па-другое, як сведчаць найбольш вопытныя вегетарыянцы, перабівае апетыт. Па-трэцяе, хутка. Схапіў і пабег. Перамены ж кароткія. А ў сталовых, дзе гатуюцца больш-менш ядомыя стравы, заўсёды выстрайваюцца вялікія чэргі. Як у хімічным корпусе ці ў наргасаўскай на Свярдлова, куды за час вучобы прызвычаіліся хадзіць студэнты-журналісты, хоць ужо і не займаюцца ў гэтым будынку. А, магчыма, прычына такой вернасці журфакаўцаў у іншым: вельмі шмат часу патрэбна, каб звычайны чалавечы страўнік звыкся з тым, што гатуецца ў сталовай на Маскоўскай. Некалькі разоў па нявопытнасці мне таксама давялося там паснедаць. Усе наступныя заняткі замест лекцыйнага матэрыялу мой арганізм з вялікім пакутамі засвойваў гэты сняданак.

Але чаго я найбольш пужаюся, дык гэта таго, што хутка і з мяне наша сістэма грамадскага харчавання з дапамогай журфакаўскай сталоўкі зробіць вегетарыянца. І хітра неяк, нібы незнарок. Бярэш, напрыклад, мясны салат з зялёным гарошкам. А ў ім — ні мяса табе, ні гароху. Адна бульба. Так бы і напісалі ў меню: салат з бульбы і цану паставілі адпаведна інгрэдыенту. Дык не — салат мясны. Праўда, адным разам неяк агурок туды трапіў (не даглядзелі, мабыць, з суседняй талеркі зваліўся). Але лепш бы не трапляў.

Дарэчы сітуацыя з харчаваннем студэнтаў журфака і юрфака, якія займаюцца на Маскоўскай, самая незайздросная. У корпусе юрыдычнага факультэта, увогуле, няма ніякай сталовай. Толькі буфет Акадэміі кіравання, дзе і цэны адпаведна не студэнцкія. А, па-другое, у буфеце можна толькі перакусіць той жа булачкай ці халодным біфштэксам. Раней юрысты снедалі ў суседняй журфакаўскай сталоўцы. Зараз туды ходзяць толькі мінчане, якім не трэба харчавацца на сваю стыпендыю, ды і не ў сталовую нават, а ў бар, але і той чамусьці ўжо не працуе. Сталуюцца на журфаку адны толькі іншаземцы. Ці то ад бязвыхаднасці, ці то ў іх, у Афрыцы, гатуюць нешта падобнае (што, зразумела, далёка не так). А можа грошай маюць болей. Карацей кажучы, я ніяк не магу ўсвядоміць: чаму?

А наш студэнт, хоць і галодны, але галавы не губляе. Сумесная беларуска-германская фірма «ЭБЕРТ-НАРПІТ» хацела нажыцца на беларускім студэнцтве: паставіла свой кіёск ва універсітэцкім дворыку. А ў ім — гарачыя сасіскі вам з кетчупам, кебаб, шашлык са свініны і ялавічыны. Але не атрымалася. Умее лічыць капейку наш студэнт. Вышэйшая адукацыя ёсць вышэйшая адукацыя, хоць і не закончаная.

2. ЛЮБЛЮ ПАЕСЦІ, АСАБЛІВА НАЖЭРЦІСЯ

А калі сур'ёзна, дык нічога смешнага няма. Смачная якасная ежа — не для студэнта. Адна сасіска ў такім кіёску каштуе, як сняданак і абед у сталовай галоўнага корпуса, куды і зайсці працэдура не з прыемных. А ў пераліку на булачкі, увогуле, астранамічныя лічбы высвечваюцца. Вось і атрымліваецца, што студэнт не мае ніякай карысці і задавальнення ад таго, што паглынае ў сталоўках і буфетах. Харчаванне для яго — неабходны фізіялагічны акт, неабходны для таго, каб бурчанне ў жываце не заглушала аповяд выкладчыка. І здзяйсняецца гэты фізіялагічны акт амаль заўсёды пры дапамозе славутай булачкі. Хоць у буфеце на геафаку, напрыклад, салат са свежага бурака каштуе не даражэй. Вось вам і магчымасць хоць як-небудзь перамагчы вясенні авітаміноз,— думала я пакуль не паспрабавала гэтыя «свежыя». Авітаміноз як рукой зняло. Затое я зразумела: не рызыкуюць студэнты купляць неправерaныя стравы, якімі б апетытнымі яны не выглядалі. А булачка — яна і ў Афрыцы булачка. Асабліва «студэнцкая». Вы ніколі не задумваліся, чаму яна так называецца? І я не задумвалася. А цяпер ведаю. У ёй няма ні павідла, ні маку, ні тварагу, адно цеста. А гэта значыць, падмануць студэнта, пазбавіўшы яго чагосьці, за што ён заплаціў грошы немагчыма (хіба толькі ўжо вельмі пастарацца).

Але я, канешне, была вельмі далёка ад ісціны, калі назвала сваіх сяброў вегетарыянцамі. Вегетарыянцтва ў сапраўдным сэнсе гэтага слова як лекавая сістэма харчавання, як прызнанне вартасцей садавіны і гародніны, іх здольнасці даць арганізму каштоўныя вітаміны, арганічныя кіслоты, мінеральныя рэчывы, а акрамя таго, вывесці шлакі зусім не мае месца ў гэтым выпадку. Герой нашага матэрыялу — гэта вегетарыянец наадварот, які абмяжоўвае сябе якраз у гэтых карысных прадуктах. Абмяжоўвае таму, што не мае магчымасці набыць ні свежых агуркоў (нават з нітратамі), ні памідораў, ні лімонаў, ні яблыкаў: не дазваляюць памеры даходу. Дый і па-сапраўднаму якасную садавіну і гародніну ў нашых магазінах шукаць — марная справа!

«А што можа прапанаваць студэнту сталовая?» — падумалася мне.

— Зялёнай цыбулі няма, свежай капусты таксама, — тлумачыць сітуацыю дырэктар сталовай № 33 Галіна Раманаўна ПЛЮХІНА.— Квашаная капуста, якую мы атрымалі, прызнаюся вам шчыра, захоўвалася на базе амаль два гады. Морква таксама паступіла да нас толькі зусім нядаўна, а да гэтага была толькі салёная. Адзінае, што ёсць — гэта агуркі. Спрабавалі мы, і не раз, прадаваць у студэнцкіх сталовых яблыкі, апельсіны, мандарыны. Але не купляюць студэнты гэтых прадуктаў, хоць цэны мы часта прапаноўваем ніжэй, чым у горадзе.

— А якія датацыі існуюць у сістэме студэнцкіх сталовых? — гэтае пытанне я задавала са стопрацэнтнай перакананасцю, нават падрыхтавалася запісаць лічбу, але ў адказ пачула:

— Ніякіх. З першага ліпеня мінулага года адмоўлена ў ва ўсіх датацыях. Студэнцкія сталовыя зараз маюць трэцюю нацэначную катэгорыю. Як, скажам, завадскія, але ў некаторых завадскіх цэны бываюць нават ніжэйшымі, бо ёсць прамыя сувязі з калгасамі. Мы ж усё закупаем на базе, дзе адзін кілаграм мінтая адпускаецца па пяцьсот рублёў, плюс наша трыццаціпрацэнтная надбаўка — і адна порцыя абыйдзецца студэнту ў рублёў сто.

Я была, як гаворыцца, у трансе. Зразумела, студэнт можа пайсці і зарабляць грошы ў вольны ад вучобы час, але якасць навучання будзе ўжо не той, і здароўе, напэўна, таксама не жалезнае. Не такое, як у нашых продкаў. Сучасны малады арганізм не мае такой моцнай імуннай сістэмы, і адна з прычын гэтага — тое ж дрэннае харчаванне.

Наступная заява Галіны Раманаўны мяне зусім збянтэжыла: з 23 красавіка падаражалі булачкі, бо цукар, які, зразумела, дабаўляецца пад час іх выпечкі, закупаецца ўжо па цане 220 рублёў за кілаграм. Бедныя студэнты! Бог з ім, з мясам ці з садавінай! Але булачкі?! Як выявілася, што ні ўсё яшчэ так дрэнна: малочны корж і крэндзель падаражалі на 2 рублі, а ўсе астатнія «смятаннікі», «вушкі» ды «сняжынкі» — на 1 рубель. І ўсё ж, непрыемна.

— Вы ведаеце, няма маіх сіл болей, калі да пенсіі застаавалася б меней — пайшла б з гэтай працы,— не вытрымала маіх пытанняў Галіна Раманаўна, ад чаго мне адразу ж стала няёмка.— Не маем мы ніякіх прыбыткаў ад студэнтаў са сваёй трэцяй нацэначнай катэгорыяй. Універсітэт павінен узяць на баланс хоць частку нашых выдаткаў, інакш мы не выжывем.

Так, складана даводзіцца і работнікам сістэмы грамадскага харчавання з заработнай платай, калі верыць дырэктару, 8—9 тысяч, і студэнтам пры галодных павarах.

III. РЭДКІ ВЕГЕТАРЫЯНЕЦ ДАЦЯГНЕ ЗДАРОВЫМ ДА АКАНЧАННЯ ВУЧОБЫ

Страўнікава-кішэчныя займаюць другое месца ў рэйтынгу студэнцкіх захворванняў. Але дрэннае харчаванне выклікае і агульную незадаволенасць, узрушэнне ўсяго арганізму, псіхікі, паніжэнне гемаглабіну. Бываюць выпадкі, калі студэнты трапляюць ва ўніверсітэцкую паліклініку ў стане непрытомнасці. Прычына ў тым жа харчаванні: не паспелі паснедаць у інтэрнаце, а булачкі раніцай яшчэ не прадаюцца.

А так хочацца да таго ж і выглядаць прывабна. Каб скура была здаровай, а не колеру глебы, каб захаваліся зубы і валасы, засталася стройнай постаць. Але якое там! Хтосьці пачытае і падумае, што я зусім з глузду з'ехала. Не. Здаровая ежа — першае і галоўнае, акрамя дадзенага прыродай, што стварае ваш знешні выгляд. Але будзем бліжэй да рэчаіснасці.

Сярод сённяшніх першакурснікаў — радыёфізікаў, біёлагаў і матэматыкаў — страўнікава-кішэчныя захворванні маюць толькі пяць чалавек. А сярод тых, хто атрымае ў гэтым годзе дыплом аб вышэйшай адукацыі,— пятнаццаць хворых на хранічныя гастрыты, халецыстыты і нават на язву дванаццаціперснай кішкі. Гэта пры тым, што радыёфізікі і біёлагі займаюцца ў Шчамысліцы, дзе ў будынку інтэрната размешчаны студэнцкі прафілакторый. Кожны месяц у ім лечыцца (трэба чытаць: сталуюцца) каля сарака студэнтаў. Амаль усе просяць пуцёўкі без засялення. Гэта значыць, што студэнтаў прываблівае таннае рэгулярнае і (трэба думаць) нядрэннае харчаванне.

На жаль, і гэта не заўсёды дапамагае. У дадатак да дыплома аб вышэйшай адукацыі малады спецыяліст звычайна атрымлівае і хваробу, як своеасаблівую плату за веды. І на ўсё жыццё захоўвае звычку: як да наркотыку цягнуцца да студэнцкай булачкі.

Вольга УЛЕВІЧ.

«МАЛЕНЬКІ»

ЧАЛАВЕК?

КАМЕНДАНТ? ПРОСТА ГАСПАДАР ДОМА

За час свайго існавання геаграфічны корпус памятае толькі двух каменданцтаў. Першы працаваў каля трыццаці гадоў, і ўжо дваццаць два гады гаспадыня корпуса — НІНА КАНСТАНЦІНАЎНА ЖАМОЙЦІНА.

Мы сустрэліся ў маленькім пакойчыку пад лесвічнай пляцоўкай. І гаспадыня адразу пачала распавядаць пра людзей, дзякуючы якім геаграфічны корпус выглядае прыстойна.

Прыбіральшчыцы, дворнік, столяр — увесь штат, які падпарадкоўваецца каменданту. Раней сюды ўваходзілі яшчэ электрык і сантэхнік. Цяпер яны маюць асобныя брыгады. Гаспадыня прызналася, што пад час водпуску ніколі не пакідае замест сябе намесніка, таму што ўпэўнена — Канстанцінаўну не падвядуць. Адноўчы нават атрымала грамату ад дэканата за добры падбор кадраў.

Ёй 68 гадоў, і яна не перастае здзіўляцца, колькі цудоўных людзей навокал:

— Няма толькі дрэнных альбо толькі добрых людзей: кожны мае свае недахопы,— гаворыць Ніна Канстанцінаўна.— Але я імкнуся верыць людзям і бачыць у іх толькі добрае. І ніколі не адштурхоўваю людзей, не адмаўляю. Мне прыемна, што якія-небудзь мае парады, а часам і проста добрыя словы дапамагаюць.

Па адукацыі яна — настаўніца. Сямігадовы ўнук Косця па сваіх здольнасцях і дзякуючы бабулі можа ісці ў чацвёрты клас; а старэйшы сын калісьці скончыў школу ў чатырнаццаць гадоў, вучыўся потым у БДУ на факультэце радыёфізікі і электронікі.

Паважаюць сапраўдную гаспадыню за мяккасць і далікатнасць студэнты. І шкло б'юць толькі ненарокам. Добра ставіцца да яе дэканат: спісанай мэблі і інвентару вельмі мала. Гэта яшчэ і дзякуючы столяру Мікалаю Ульянавічу Хахлову. Яму ўжо 72 гады. Некаторым здаецца, што трэба знайсці маладзейшага, але гаспадыня ўпэўнена — лепшага не бывае. Таму што Мікалай Ульянавіч — майстар на ўсе рукі.

— На гаспадара навучыць немагчыма, можна толькі растлумачыць, якім павінен быць сапраўдны гаспадарнік,— гаворыць Ніна Канстанцінаўна,— а калі гаспадар усё ж не склаўся, такі чалавек можа прынесці нават шкоду.

Т. КАЗАК.

САКРЭТ ФІРМЫ

ВЕЛАПРАБЕГАМ — ПА ЧАРНОБЫЛЮ

Студэнты мінскіх вышэйшых навучальных устаноў збіраюцца ў вандраванне на веласіпедах па магістралях Польшчы, Германіі, Нідэрландаў, Бельгіі.

Вандроўка будзе доўжыцца сорак дзён. І за гэты час студэнты спадзяюцца прыцягнуць увагу грамадскасці да людзей, якія пакутуюць ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

ПАСТАВІЛІ НА БАНК

Інвестыцыённы акцыянерна-камерцыйны банк вышэйшай школы створаны ў Казахстане. Яго заснавальнікамі з'яўляюцца больш за 20 навучальных устаноў рэспублікі, буйныя прамысловыя прадпрыемствы, вядомыя вучоныя, якія выдаткавалі на новую справу свае асабістыя грошы.

Асноўная мэта стварэння банка — дапамога ВНУ ва ўмовах рынку. Акрамя спецыяльных праграм, банк заснаваў 15 імянных стыпендый.

ШАГАМ МАРШ ДА РЫНКУ!

У Маскве арганізаваны бізнес-клуб «Тверской бульвар». Яго заснавальнікі — прафсаюзныя работнікі навукі і адукацыі, акадэмічныя інстытуты і вышэйшыя навучальныя ўстановы сталіцы, члены Саюза навуковых і інжынерных таварыстваў, прадстаўнікі малога бізнесу.

Клуб намерваецца дапамагаць пад час устанаўлення дзелавых сувязяў паміж вучонымі.

ПЯЦЬ ХВІЛІН ДА КАХАННЯ

Пяць хвілін да кахання. Шмат гэта ці недастаткова? Каб, не нарабіўшы памылак, дарасці да ўсведамлення кахання. Каб прагматызм разам з імкненнем да камфорту не здолеў пазбавіць цэлае пакаленне салодкіх мук і пакут. Каб тыя, хто вырас у мане, паспелі працягнуць руку дапамогі тым, каму прыйдзецца пераадолець нянавісць і раўнадушша.

«Кахання не існуе. Я так лічу. Гавораць, яго выдумалі рускія, каб не плаціць».

Гэта святое перакананне аднаго з герояў дакументальнага фільма «Пяць хвілін да кахання». Знайшліся ў нашым азлобленым грамадстве два чалавекі, якія ўсур'ёз зацікавіліся пытаннем: «Каму яно патрэбна, гэтае каханне?» У гэтым фільме кінематаграфісты Эла МІЛОВА і Ірына ПІСЬМЕННАЯ шукаюць адказ у трынаццаці-семнаццацігадовых дзяўчынак і хлопцаў — прадстаўнікоў таго ўзросту, які заўсёды імкнуўся да кахання, чакаў яго з нецярплівасцю. Шукаюць і... не знаходзяць.

— Так-так,— пацвярджальна ківае галавой Эла Абрамаўна, адчуўшы на сабе мой недаўменны позірк.— Для нас гэта таксама самы галоўны і нечаканы вывад — іх не цікавіць каханне. Яны настроены ўспрымаць яго як звычайную частку баўлення часу. Лепш каб яна была невялікай, не прыносіла б пакут і смутку. Таму, што не адно пакаленне зямлян лічыла боскай ласкай, сённяшнія падлеткі і юнакі адводзяць функцыі фізіялагічныя і бытавыя. Душа пры гэтым застаецца некранутай.

— Гэта іх віна, па вашаму меркаванню?

— Як мне здаецца, бяда. Але мы ж не шукалі вінаватых — мы проста назіралі за тым бязглуздым жыццём, у якім праблемы нашых юных герояў мала каго хвалююць. Наверсе горад — ці будуецца, ці руйнуецца, а яны пад зямлёй (у пераходах метро), дзе найбольш утульна і ясна для іх. Ці за высокай сцяной спецустановы. У іх няма душэўнага інструментарыя — тых струнаў і клавішаў, на якіх іграюць пачуцці. Дзіўная сітуацыя — яны нешта гавораць, шукаюць, нечага патрабуюць, а вочы ўсё роўна застаюцца абыякавымі. Іх душы **не развітыя, не падрыхтаваныя да таго, каб звінець,** дрыжаць, пакутваць.

— І вы спадзяецеся, што за пакінутыя да дарослага жыцця пяць хвілін нешта ці нехта здольны ім дапамагчы?

— Магчыма, дарослыя, што прапусцілі нешта істотнае ў дзяцінстве, паімкнуцца перайначыць. Яны нарадзілі дзяцей, знайшлі для іх прыгожыя імёны, забяспечылі дахам над галавой, але забыліся на душу. Нашы героі — асобы неардынарныя, але не сустрэлася за іх кароткае жыццё чалавека, які б гэта заўважыў. Цяпер у жорсткім свеце, атрыманым у спадчыну, яны самі спрабуюць выжыць. Калі мы здымалі фільм, мы разумелі, што павінны стаць скальпелем. Калі гаварыць паціху, наша самазадаволенае грамадства проста не пачуе.

— Ваш фільм рознапланавы. Маленькі бомж глядзіць услед цягніку, які ад'язджае, дзяўчынкі з Петрыкаўскага спецвучылішча, іх мамы, «дзеці падзямелля» студэнты універсітэта і пачынаючыя бізнесмены, малалетнія маці і непаўналетнія забойцы... Гэта можна палічыць нагрувашчваннем сю жэтаў. Ці ацаніць, як жыццёвы калейдаскоп...

(Працяг на 4-й стар.).

РЫХТУЙЦЕСЯ

Канферэнцыя на Сёмуху. Фестываль на Троіцу

Напачатку чэрвеня ў Мінску на базе філалагічнага факультэта нашага універсітэта пройдзе навукова-практычная канферэнцыя «Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці». Вялікі ўдзел у яе арганізацыі прымае навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору і дыялекталогіі. З яе старшым навуковым супрацоўнікам Васілём Дзмітрыевічам ЛІЦВІНКАМ сустрэўся наш карэспандэнт.

— Васіль Дзмітрыевіч, якія задачы стаяць перад маючай адбыцца канферэнцыяй?

— Нацыянальнае адраджэнне пачынаецца з адраджэння культуры,— гаворыць В. Д. Ліцвінка, які на грамадскіх пачатках з'яўляецца яшчэ і прэзідэнтам Асацыяцыі фальклярыстаў Беларусі.— А багаты беларускі фальклор складае неад'емную частку нашай культуры. У рэспубліцы, асабліва ў аддаленых вёсках, па сённяшні дзень захаваліся многія старадаўнія народныя звычаі і святы. Некаторыя з іх дайшлі да нас нават з дахрысціянскіх часоў. І каб усё гэта не адышло ў нябыт, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да беларускага фальклору, да ягонай самабытнасці, вырашана правесці навукова-практычную канферэнцыю.

— Сёння ўжо можна прадбачыць, як яна будзе праходзіць?

— Пачатак работы канферэнцыі супадае з народным святам — Сёмухай (3 чэрвеня). Пасля адкрыцця перад прысутнымі выступяць з дакладамі ганаровы прафесар БДУ, загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта А. Баршчэўскі (тэма — «Этычнае, эстэтычнае і нацыянальнае ў фальклоры»); першы намеснік міністра культуры Беларусі У. Гілеп («Аб выкарыстанні фальклору ў працы культурна-асветніцкіх устаноў»); намеснік міністра адукацыі Г. Бутрым («Аб выкарыстанні фальклору ў дзіцячых садках»). Я паімкнуся засяродзіць увагу прысутных на праблеме выкарыстання фальклору як сродка нацыянальнага адраджэння. Закончыцца першы дзень канферэнцыі выступленнем лепшых дзіцячых фальклорных калектываў.

На другі дзень запланавана праца па секцыях. Іх усяго чатыры: фальклор і вёска, маладзёжны фальклярыстычны рух, фальклор як сродак выхавання дзяцей, прапаганда фальклору ў сродках масавай інфармацыі. А потым у час фестывалю маладзёжных фальклорных калектываў выступяць «Палешукі» з Бярэсця, «Вытокі» з Віцебска, «Гарадніцы» з Гародні, «Неруш», «Ліцвіны» з Міншчыны. Увечары надыдзе пара вясковых фальклорных калектываў з усіх фальклорна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Паазер'я, Панямоння, Падняпроўя, Палесся, Цэнтральнага рэгіёна).

І яшчэ. Два наступныя дні нрыпадаюць на народнае свята — Троіцу. У Маладзечне будзе праходзіць фестываль беларускай песні. Выступяць там і ўсе фальклорныя калектывы — удзельнікі Мінскай канферэнцыі.

— Хто выступае ў ролі арганізатараў канферэнцыі?

— Асацыяцыя фальклярыстаў Беларусі і тры міністэрствы: адукацыі, інфармацыі і культуры. Збяруцца на канферэнцыю работнікі адукацыі і культуры, навукоўцы, творчая інтэлігенцыя. Запрошаны таксама журналісты газет, радыё, тэлебачання.

А. ЮРЫН.

Па ўзнікшых пытаннях вы можаце звярнуцца да Васіля Дзмітрыевіча па тэлефоне: 27-65-83.

ПРАГНОЗ

У БЕСПРАЦОЎЯ — ЖАНОЧЫ ТВАР

Рыначныя адносіны ў нашай эканоміцы яшчэ паспелі сфарміравацца, але ўжо стварылі несбалансаваны па попыту і прапановах рынак працоўнай сілы. Чым і выкліканы няўхільны рост беспрацоўных. Сітуацыю каменціруе начальнік аддзела сацыялагічных даследванняў Рэспубліканскага цэнтра занятасці насельніцтва Валянцін Андрэевіч Ладуцька:

— У беспрацоўя, нягледзячы на граматычную прыналежнасць да сярэдняга роду, твар жаночы. У буйных гарадах сярод тых, хто шукае работу, 83 працэнты — жанчыны; у сельскай мясцовасці і вёсках гэтая лічба некалькі менш.

Сярод «неблаганадзейных» прафесій для жанчын на першым месцы стаяць прыродазнаўчанавуковыя і тэхнічныя спецыяльнасці. Раней за іншых адчулі гэта на сабе канструктары, праекціроўшчыцы, сметчыцы — тыя, хто прымаў удзел у навуковым абслугоўванні праектных распрацовак у інстытутах. Скарачалі іх таму, што без работнікаў сярэдняй кваліфікацыі абыйсціся можна.

Ёсць і прыемны для ўсіх нас факт: калі ў пачатку 1992 года 60 працэнтаў беспрацоўных складалі спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, дык у пачатку 1993 года іх колькасць паменшылася на 20 працэнтаў. Магчыма, хутка мы наблізімся тут да паказчыкаў развітых капіталістычных краін, дзе сярод высокакваліфікаваных спецыялістаў працэнт беспрацоўных ніжэйшы, чым сярод некваліфікаваных.

На атрыманне якіх спецыяльнасцей варта цяпер арыентавацца слабаму полу? Зразумела, не тэхнічнага складу. На сённяшні дзень гэта — рэальная неабходнасць.

А. РЫЖЫКАВА.

СЭРЦА АДЧУВАЕ І ХВАЛЮЕЦЦА

Сэрца чалавека — дзіўны орган. Кожны заўважыў, што ў розных жыццёвых сітуацыях яго скарачэнні могуць быць то больш частымі, то замаруджанымі. Яно «адчувае» і «хвалюецца» разам з намі.

Падлічана, што ў чалавека, які знаходзіцца ў стане адноснага спакою на адпачынак сэрца ў суткі даводзіцца ўсяго толькі 4 гадзіны. Значыць, за 60 гадоў жыцця яно адпачывае толькі дзесяць. Унушальна? Так. Але гэта датычыць толькі нетрэніраванага сэрца з частатой скарачэнняў 70—72 удары ў хвіліну. У спартсмена яно скарачаецца 50—60 разоў, адсюль у выгрышы яго адпачынак.

У поўных людзей рух дыяфрагмы абмежаваны: яна быццам падпірае сэрца, абцяжарваючы яго работу. Практыкаванні для мышцаў жывата, прысяданні, пад'ёмы ў гару, хадзьба па лесвіцы, хадзьба на месцы высока паднімаючымі калені, падцягванне ног да жывата і іншыя практыкаванні дапамагаюць не толькі ліквідаваць лішак вагі, але і садзейнічаюць паляпшэнню дыяфрагмавага дыхання, што значна паляпшае работу сэрца.

Фізічныя практыкаванні ўдасканальваюць усе звенні нервовай сістэмы — зрок, слых, вестыбюлярны апарат...

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

МОМАНТЫ ФЕСТЫВАЛЮ КІНАМАТАГРАФІСТАЎ

ПЯЦЬ ХВІЛІН ДА КАХАННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

— Сітуацыі мы адбіралі, каб як мага больш маштабна паказаць, што ўяўляюць сабой падлеткі і юнакі. Можна зняць пра гэта некалькі стужак. Нам жа хацелася зафіксіраваць настрой душы, адчуванне агульначалавечых каштоўнасцей у гэтым узросце, у дадзеным грамадстве, у дадзены гістарычны момант. Мы сустракаліся з якой-небудзь групай, каб потым засяродзіць увагу гледача над нечай сітуацыяй. Мы шукалі каханне. Нашы героі альбо не чакалі, альбо не верылі ў гэтае пачуццё, альбо адмаўляліся ад яго.

— Значыць, фільм для дарослых, якія павінны зрабіць вывады і прыняць меры?

— Хутчэй для тых з іх, хто спрабуе зразумець дзяцей, а таксама для падлеткаў і юнакоў, якія, магчыма, самі паспрабуюць сябе ацаніць і прыняць самастойныя рашэнні. Мы ж нікому не навязваем свой пункт гледжання.

Гутарыла
З. МАРАВА.

ШТО ПАДАЕ КОЖНЫ ДЗЕНЬ НА ГАЛАВУ ДЫРЭКТАРА КУПАЛАЎСКАГА ТЭАТРА

ПІРУЭТ

Беларускі дзяржаўны акадэмічны. Яшчэ не так даўно стаўленне да яго было зусім іншым. Інтарэс да яго не абумоўліваўся дзяржаўнай палітыкай, і інтэлігенцыя не мела ў ім асаблівай патрэбы, журналісты не лічылі яго «цікавай тэмай». Але, як гэта заўсёды здараецца ў жыцці, усё змянілася: тэатр апынуўся ў становішчы моцнага. Спектаклі сталі цікавымі, акцёры таленавітымі, а БДАТ — сур'ёзным тэатральным калектывам. А галоўнае — той асновай, на якой яшчэ магчыма адрадзіць беларускую мову і нацыянальныя традыцыі ў мастацтве.

Але што я, сапраўды. Больш за дырэктара, Івана Іванавіча ВАШКЕВІЧА пра тэатр усё роўна ніхто не скажа.

— Іван Іванавіч, назіраючы сучаснае становішча ў тэатры неяк спакваля прыходзіш да высновы, што менавіта сёння для яго развіцця створаны найбольш спрыяльныя ўмовы. Больш смелым і разнастайным стаў рэпертуар...

— Я вам скажу, што тэатр заўсёды быў такім. У сталінскія часы — «Хто смяецца апошнім?» Вы ведаеце, што гэта такое? Сёння сыграл і, а заўтра маглі ўжо на Калыме... іграць. Але дазвалялася нейкім чынам. А калі мы ставілі «Надзею Путніну», збіралі грошы на «Мартыралог Беларусі» і першы нацыянальны сцяг павесілі ў тэатры, я тры дні запар быў блізкі да інфаркту: у маім кабінеце ўвесь час стаялі прадстаўнікі тагачаснага КДБ, райвыканкама, гарвыканкама, ЦК партыі. Зараз гэты сцяг лунае над будынкам Вярхоўнага Савета.

Гістарычна так склалася, што Купалаўскі тэатр стаў асяродкам талентаў самай высокай пробы, нават стварыў сваю, як цяпер модна казаць, творчую аўру. І гэтая аўра не прымае ўсялякае рамесніцтва. Пагадзіце, якія імёны звязаны з нашым тэатрам: Станюта, Макарава, Платонаў, Глебаў, Браварская, Дзядзюшка, Яроменка, Захарэвіч, Давідовіч, Гарбук, Аўсяннікаў — гонар нацыі. Гэтыя імёны ўжо не належаць толькі нашаму тэатру, яны — набытак сусветнай духоўнай культуры.

— Старое пакаленне Купалаўскага тэатра — бясспрэчна, таленавітыя і вядомыя акцёры. Іх імёны гавораць самі за сябе. А маладыя? Яны ў стане захаваць належны ўзровень мастацтва і цікаўнасць гледача да тэатра?

— У нашым тэатры існуе такі звычай, асабіста я яго вельмі падтрымліваю: маладыя акцёры, якія толькі прыходзяць у трупу, адразу атрымліваюць самыя сур'ёзныя ролі. Гэта экзамен на трывалась. Хоць у тэатры ўсе вельмі добра ставяцца адзін да аднаго, але вока — усё бачыць, і не толькі ў мастацтве. Той-сёй і не вытрымлівае. Проба ў нас вельмі высокая. І моладзь застаецца выдатная: Віктар Манаеў, Зоя Белахвосцік. Ёсць і зусім маладая дынастыя Лабушаў: Галя Фёдарава, сам Аляксандр Лабуш і аж трое Лабушатаў. Яны таксама іграюць. Сашкамалы на сцэне ў спектаклях «Страсці па Аўдзею», «Дом на мяжы». Спачатку памятаю: дырэктарам стаць хацеў, а потым неяк пытаюся: будзеш дырэктарам? «Не,— адказвае,— буду «алтыстам». Дырэктарам не «харасо». Чамусьці яму так падалося.

— Іван Іванавіч, а ці не адбываецца так, што людзі, якія працуюць сёння ў тэатры, ствараюць нашу духоўную культуру, сталі безабароннымі ў сучасных умовах?

— Трэба адзначыць, урад усё ж такі разумее, што духоўнай культуры трэба дапамагаць, каб выратаваць. Ранейшае бюджэтнае фінансаванне ад 1,7 працэнта павялічылася да 2,6. Апошняе павышэнне заработнай платы дазваляе нам жыць не шыкоўна, а, скажам так, нармальна. Але яшчэ гадоў шэсць таму назад я, на ўласную рызыку, узяў на даплату нашых артыстаў пенсійнага ўзросту. Бо пенсія цяпер — гэта ж здзек, а не грошы. Народнаму артысту — 6 тысяч! У адзін момант зрабілі жабраком. І я лічу, што дапамагчы ім — мой маральны, святы абавязак, бо нельга да чалавека, чыімі думкамі, голасам і душой прасякнута сцэна, ставіцца па-іншаму.

— Атрымліваецца, вы выконваеце абавязкі нашай дзяржавы?

— Ну а што зробіш? Інакш проста немагчыма: ты зайшоў адчыніў дзверы і на тваю галаву пачынаюць сыпацца праблема за праблемай. А ў 19.00 заслона павінна ўзняцца, нягледзячы ні на што.

— І ўсё ж такі хочацца спадзявацца, што фінансавае становішча БДТА палепшылася?

— У папярэднія гады грошай, якія выдзяляла нам Міністэрства культуры было дастаткова. Але штомесячнае павышэнне цэн дае сябе знаць. Калі раней спектакль каштаваў сто-дзвесце тысяч рублёў, то апошняя прэм'ера — «Нежанаты мнагажэнец» Мальера — абыйшлася ў 2 мільёны. Хутка, з нагоды 140-годдзя з дня першай пастаноўкі, мы будзем ставіць «Сялянку» Дуніна-Марцінкевіча. Плануем выдаткаваць на гэта мільёнаў шэсць. Невядома, колькі грошай нам дадуць. Магчыма, давядзецца выкручвацца самім.

Але, каб вам да канца была зразумела гэтая сітуацыя, зарабляем мы ўсяго працэнтаў 12, усё астатняе дае дзяржава. Гастролі пры поўных аншлагах — гэта недзе 10 працэнтаў ад той сумы, якая патрэбна на іх арганізацыю. Дарэчы, гастрольная дзейнасць прыпынілася зараз ва ўсіх тэатрах.

— Як гэта, прабачце, ніякіх зносін з навакольным светам, ніякіх творчых сустрэч?

— Не, мы перайшлі на фестывальную дзейнасць. Едзем у Беласток, бо той бок нам плаціць. Затым у Ялту вазілі «Тры сястры», у красавіку таксама — міжнародны фестываль у Харкаве. А потым зноў будзем сядзець дома і нікуды... Праўда, у вёску будзем па-ранейшаму ездзіць, на гэтыя гастролі выдзяляе сродкі Савет па культуры пры Міністэрстве. На Беларусі хапае мясцін, адкуль людзі ў наш тэатр ніколі не трапяць. Не адзін раз так здаралася: прыязджаем у вёску са спектаклем, а пасля бабулькі нам дзякуюць, што перад смерцю такі цуд пабачылі. І далейшая палітыка наша такая — мы не намераны ўздымаць цэны на білеты. Інакш у тэатр зусім перастануць хадзіць. Бо людзей, якія маюць пастаянную патрэбу ў тэатры, вельмі мала: па сацыялагічных даследаваннях гэта прыкладна тры працэнты ад агульнай колькасці насельніцтва Мінска. Гэты слой складаецца з самых розных сацыяльных груп. Але калі б людзі, якія лічаць сябе інтэлігенцыяй сапраўды цікавіліся нацыянальным тэатрам, у нас была б чарга на тры гады наперад. На жаль, узровень духоўнасці такі, што многім хапае «Багатых...», якія таксама плачуць.

— Іван Іванавіч, нашым мастацтвам усё больш пачынаюць цікавіцца за мяжой. БДАТ адчувае на сабе гэтую ўвагу?

— Нашым тэатрам не толькі цікавяцца, але і робяць цікавыя прапановы. Восенню, напрыклад, французы будуць ставіць у нас свой спектакль «Дон-Жуан вяртаецца з вайны». Працаваць над спектаклем будзе французскі рэжысёр Стэфанія Лаік, тры гады таму яна была прызнана лепшым рэжысёрам Францыі, зараз кіруе Латарынгскім нацыянальным тэатрам. Ужо адабраны выканаўцы ўсіх галоўных роляў. Пасля таго, як спектакль будзе пастаўлены і паказаны ў нас, плануюцца гастролі ў Францыі. Прэзідэнт Мітэран узяў на сябе абавязкі патраната над гэтым праектам. П'ер Кардэн запрашае спектакль асабіста да сябе ў тэатр, абяцае пашыць усе касцюмы.

З Балгарыяй, са Славеніяй у нас таксама добрыя даўнія сувязі. Польскі рэжысёр Анджэй Якімец паставіў у нашым тэатры «Дом на мяжы». А купалавец Валерый Раеўскі скончыў работу над «Рэвізорам» у Беластоку.

Але калі раней сувязі з замежжам нам перабівалі маскоўскія тэатры, то зараз з'явіліся іншыя цяжкасці: тэатр, як і дзяржава, не багаты, а калі шчыра казаць, то нават бедны. Любыя ж замежныя гастролі патрабуюць вялікіх сум у валюце. Мы разумем гэта, таму вядзем сябе вельмі сціпла, не турбуем ні ўрад, ні міністэрства, а самі паціхеньку ў «свет белы» праз міжнародныя фестывалі, праз творчыя сувязі ідзем.

— Іван Іванавіч, гледзячы на афішы вашага тэатра, я не раз здзіўлялася: у рэпертуары тэатра акрамя п'ес беларускіх аўтараў ёсць і п'есы Коўберна, Мал'ера... Ва.ўмовах дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі вы не абмяжоўваецеся, як гэта заўсёды ў нас робіцца, толькі творамі беларускай драматургіі?

— Асноўны крытэрый адбору п'ес для пастаноўкі ў Купалаўскім тэатры — іх высокі ўзровень. Я не разумею такога падыходу: хоць дурны, але свой. У нас ёсць «Вольная сцэна», дзе адпрацоўваюць сваё майстэрства пачаткоўцы, і, глядзіш, з гэтага штосьці атрымліваецца. Але калі п'еса слабая і не вартая ніякай увагі, я не магу ўвесь тэатр прымусіць на яе працаваць. Ёсць і яшчэ адзін момант: мы самастойныя, але не з хутаранскай філасофіяй, што за плотам свету не бачым. Не, мы жадаем бачыць свет і лепшае ў свеце. І да гэтага лепшага далучацца, каб самім вышэйбыць. Жаданне зрабіць з сябе большых беларусаў, чым мы ёсць,— гэта ж проста прымітыўна.

— І тое, што сапраўднае адраджэнне беларускай мовы і культуры ідзе ў вашым тэатры, гэта адчуваецца?

— Безумоўна. Але ж гэта не так лёгка даецца. Напачатку гэтай плыні той-сёй пайшоў з нашага тэатру. А нада мной на адным з творчых капусніках нават насміхаліся: нейкі археолаг будучыні пад трохтысячным слоем чагосьці заўважыў з космасу, што нейкая там беларуская мова калісьці была. Зараз у тэатры ўжо паціхеньку пачынаюць размаўляць па-беларуску. Заняткі па мове вядуцца не толькі для артыстаў, але і для кіраўнікоў тэхнічных цэхаў.

А калі я прыйшоў у тэатр, гэта ж дзікунства было — усе дакументы на рускай мове. Я ўсе загады хуценька пераклаў. І ў 1982 годзе запрасіў у тэатр вучоных з Інстытута мовазнаўства Акадэміі Навук. Яны ўсе спектаклі прааналізавалі і прайшлі да высновы: у вас, народныя артысты рэспублікі, не проста дрэнная мова, а жудасная. На мастацкай радзе я вынес рашэнне знізіць зарплату за дрэнае веданне мовы. І адразу ж у КДБ ідзе заява: нацыяналіст Вашкевіч уціскае пэўныя нацыянальнасці і ўсё такое іншае. Вызвалі мяне — пішы «абъяснительную». А што пісаць? Ну я трошкі схітраваў, канешне... Але палітыку сваю працягваў.

І год назад на калегіі Міністэрства я казаў: хлопцы, давайце пачынаць размаўляць па-беларуску, сківіцы трашчаць будуць, язык нібы вывальвацца ад нязвыкласці... Год прайшоў — гавораць, памыляюцца, але ж мову вучаць. А хто больш спрытны, дык ужо выдатна яе ведае. Не хвалюйцеся, чыноўнікі, якія атрымліваюць даброты за сваё крэсла, мову хуценька вывучаць. А выкладчыкі, журналісты? Калі ты маеш вышэйшую адукацыю, дык таксама ж трэба неяк напружвацца.

— Іван Іванавіч, а вам не здаецца, што, як раней партыйны білет, зараз веданне беларускай мовы ці нават пераафарбаванне ў гэтую беларускамоўнасць адкрывае нейкі шлях для перасоўвання на лепшае месца?

— Не. Там, дзе сур'ёзны розум,такога няма, і сярод інтэліўгенцыі такое не павінна адбывацца. Бо інтэлігент — гэта не проста чалавек, які мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень і добра валодае сваёй прафесіяй. Гэта разумны чалавек, які ўсведамляе гармонію сусвету, высокую мараль і аддае свае духоўныя веды.

— А як складваюцца адносіны Купалаўскага тэатра з беларускай інтэлігенцыяй?

— Сапраўдная беларуская інтэлігенцыя выхавалася на нашым тэатры. І нават Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч прызнаўся мне неяк, што заўсёды сядзеў на галерцы і лічыць тое беларускае, што ў яго ёсць,— ад купалаўскага тэатра, ад Глебава, ад Ржэцкай, ад «Дзён цудоўных падманаў», ад «Паўлінкі». Мова наша ўжо бярэцца за ўзор, і ў спрэчных выпадках раней прыводзілі такі аргумент: так гаворыць Ржэцкая, і, напэўна, так будзе правільна.

— Іван Іванавіч, у параўнанні з вашым тэатрам Рускі акадэмічны сёння выглядае разгубленым і не выклікае такой цікаўнасці ў гледача. Чаму так адбываецца, і ці нармальна гэта?

— Рускаму тэатру трэба знайсці сваё новае крэда: хто яны сёння? Здзіўляліся гарачыя галовы, якія казалі, што Рускі тэатр — гэта інструмент сталінскай русіфікацыі, яго трэба закрыць і аддаць пад сінагогу, што была там раней. Але ж гэта культура. І якая культура! З мастацтвам трэба быць вельмі асцярожным, бо ствараецца яно гадамі, а страчваецца вельмі хутка. Дзе-нідзе ўжо нават пазакрывалі рускамоўныя тэатры. А навошта? Калі Рускі тэатр будзе правазвеснікам сучаснай рускай драматургіі — гэта выдатна. Іншая справа, калі ён ператворыцца ў беларускі рускамоўны тэатр... Але, у рэшце рэшт, ёсць людзі, ідуць, глядзяць — ёсць тэатр, няма гледача — няма тэатра.

За дзвярыма я раптам уцяміла: а дырэктар, напэўна і тут схітрыў. Усё неяк гладка ды ладна атрымліваецца. А вось і «Вольная сцэна» хоча стаць больш самастойнай, ды і крытыкі БДАТ не вельмі ўсхваляюць...

У кожнага, безумоўна, могуць быць свае меркаванні наконт гэтага тэатральнага калектыва, наконт сапраўднага беларускага адраджэння. Але дрэнны той дырэктар, які не абараняе і не ўхваляе свой тэатр.

Вольга УЛЕВІЧ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВІПА імя Я. Коласа.

29 красавіка

Зак. 1702.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.